УДК 930.(476)

***А.А. Савіч***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЙ ГРАМАДЫ (да 90-годдзя партыі)

*У даследаванні адлюстраваны асноўныя навукова-метадалагічныя і крыніцазнаўчыя паказчыкі развіцця і ўдасканалення айчыннай гістарыяграфіі Беларускай сялянска-работніцкай Грамады ў другой палове 1920-х – 2000-я гады. На падставе шырокага кола гістарыяграфічных і архіўных крыніц выяўлены этапы ў развіцці гістарыяграфіі пытання, асноўныя падыходы да вывучэння гісторыі БСРГ, фармулёўкі і ацэнкі дзейнасці партыі і яе кіраўнікоў, зроблена выснова аб наяўнасці падстаў для стварэння больш аб'ектыўнай гісторыі БСРГ.*

## Уводзіны

Беларуская сялянска-работніцкая Грамада (БСРГ) з'яўляецца яркім прыкладам высокай палітычнай арганізацыі і кансалідацыі беларускага народа вакол ідэй нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. «Стотысячная Грамада» ў гістарычнай памяці беларусаў на многія гады стала сімвалам-легендай, пацверджаннем здольнасці і натуральнага імкнення беларусаў да дзяржаўна-палітычнай самаарганізацыі, грамадзянскай спеласці народа, яго гонару і годнасці. Гістарычнае значэнне Грамады выяўляецца і ў тым, што прадстаўнікі розных ідэйна-палітычных беларускіх груповак змаглі ўзняцца над сваімі вузкапартыйнымі і асабістымі прыярытэтамі і працаваць у агульным грамадоўскім рэчышчы.

Гістарыяграфія БСРГ з'яўляецца красамоўным сведчаннем грамадска-палітычнага і навукова-даследчага інтарэсу да гэтай партыі. За 90-гадовы адрэзак шляху ад стварэння Грамады да сучаснасці інтэнсіўнасць вывучэння і асвятлення ў друку адпаведных пытанняў яе гісторыі дыяпазон праблематыкі і даследчыя фармулёўкі неаднойчы мяняліся, дэманструючы супярэчлівае стаўленне і неадназначнае адлюстраванне. За выключэннем асобных згадак адносна агульных пытанняў вывучэння гісторыі БСРГ, у гістарыяграфіі адсутнічаюць даследаванні, прадметна скіраваныя на асэнсаванне працэсу навуковай рэканструкцыі і інтэрпрэтацыі гісторыі Грамады, якія выяўляюць асноўныя паказчыкі гістарыяграфічнага даследавання. Таму гістарыяграфічны аспект гісторыі БСРГ мае высокую ступень актуальнасці і навукова-практычнае значэнне. Мэта дадзенага даследавання – акрэсліць навукова-тэарэтычныя мадэлі працэсу навуковага вывучэння Грамады айчыннымі гісторыкамі, выявіць іх асаблівасці на працягу розных перыядаў, а таксама сучасны стан даследавання і перспектывы далейшага паглыблення яго праблематыкі.

## Станаўленне і развіццё гістарыяграфіі БСРГ у сярэдзіне 1920-х – 2000-я гг.

Гістарыяграфія Грамады пачала сваё фарміраванне з сярэдзіны 1925 г., калі ў перыядычным друку Польшчы, а потым БССР і СССР пачалі з'яўляцца паведамленні пра палітычныя акалічнасці, звязаныя з расколам Беларускага пасольскага клуба, выхадам з яго беларускіх паслоў на чале з Б. Тарашкевічам, стварэннем самастойнай фракцыі і арганізацыйнай працай па стварэнні Беларускай сялянска-работніцкай Грамады як палітычнай партыі. Напрыклад, на старонках «Праўды» і «Савецкай Беларусі» ў чэрвені–ліпені з'явілася перадрукоўка з польскай газеты «Эха Варшавы» гутаркі з Б. Тарашкевічам, які заявіў: «Нашу праграму можна змясціць у гэткай формуле: "Злучаная Беларусь пад уладай рабочых і сялян"» [1; 5; 24, арк. 73–74; 39].

Вызначальнай акалічнасцю, якая паўплывала на фарміраванне гістарыяграфічнай традыцыі БСРГ, стала яе вядомая арганізацыйная сувязь з КПЗБ, а праз яе з БССР і СССР, у навуковых установах якіх ажыццяўлялася даследаванне заходнебеларускай праблематыкі і забяспечвалася ідэалагічнае абгрунтаванне неабходнасці рэвалюцыйнай барацьбы ў Заходняй Беларусі, на вышэйшым партыйным і дзяржаўным узроўні прымаліся рашэнні аб арганізацыі кампаній у падтрымку Грамады, аб падрыхтоўцы і выданні матэрыялаў аб БСРГ. Цікавасць у гэтым сэнсе выклікае водгук у БССР на падзеі, звязаныя з разгромам Грамады польскімі ўладамі і маючым адбыцца судом над яе правадырамі ў Польшчы. У прыватнасці, 4 сакавіка 1928 г. на імя сакратара ЦК УКП(б) Ст. Касіёра зусім сакрэтна быў накіраваны ліст з ЦК КПБ аб тым, што ў г. Мінску на агульнагарадскім сходзе навуковых работнікаў і пісьменнікаў, скліканым у сувязі з працэсам Грамады, абраны «Камітэт навуковых работнікаў і пісьменнікаў па абароне Беларускай сялянска-рабочай Грамады», старшынёй якога быў Янка Купала. Задачай камітэта з'яўлялася «арганізацыя разам з МОПРам пратэсту з боку грамадскіх дзеячаў, пісьменнікаў і вучоных супраць працэсу, даказваючы, што працэс з'яўляецца судом над усім беларусім народам і над дзеячамі беларускай культуры, у мэтах нацыянальнага прыгнёту і закабалення беларусаў». У лісце падкрэслівалася папярэдняя дамоўленасць адносна стварэння камітэта і прадпрынятых захадаў з самім Ст. Касіёрам і тое, што ўсе рашэнні Камітэта папярэдне ўзгоднены з ЦК КП(б)Б і прадстаўніком наркамата замежных спраў. Згаданы камітэт на сваім пасяджэнні 1 сакавіка 1928 г., акрамя вядомай адозвы «К научным и культурным деятелям и трудящимся всего мира!», прыняў рашэнне выдаць невялікую брашуру (ад ½ да 1 аркуша) аб становішчы Заходняй Беларусі і працэсе Грамады. У брашуры прадугледжвалася «зьмясьціць кароткі нарыс гісторыі і эканомікі Зах. Беларусі і выявіць твар грамады. Даць клішэ беларускіх паслоў, …зьмясьціць адозву камітэту і пратэста к-ту да ўраду Польшчы. Брашуру даручыць напісаць т. Ігнатоўскаму ў працягу тыдню» [23, арк. 56, 59–66]. Улічваючы вышэйадзначанае, становяцца зразумелымі абумоўленасць, матывацыя і ідэйна-палітычная скіраванасць добразычліва-пафасных айчынных публікацый аб Грамадзе ў другой палове 1920-х – пачатку 1930-х гг. [2; 4; 17; 18]. Арганізацыя характарызавалася як самая ўплывовая ў Заходняй Беларусі. У перыяд існавання БСРГ і суда над ёй аўтары з сімпатыяй ставіліся да партыі, аднак, знаёмячы з асноўнымі пунктамі праграмы Грамады, даводзілі, што ў яе праграме і дзеяннях пераважала не рабочая, а сялянская ідэалогія, падкрэслівалі дробнабуржуазны, некамуністычны характар БСРГ, хоць яна бліжэй за іншыя палітычныя арганізацыі стаіць да партыі пралетарыяту – КПЗБ.

Польскія ўлады абвінавачвалі БСРГ у антыдзяржаўнай дзейнасці, сувязі з забароненай у Польшчы кампартыяй і савецкімі спецслужбамі, таму для КПЗБ, кіраўніцтва БССР і СССР былі непажаданымі згадкі пра трывалыя ўзаемаадносіны Грамады з бальшавіцка-камінтэрнаўскім падполлем. У публікацыях, відавочна, з-за жадання замаскіраваць арганізацыйную сувязь Грамады з КПЗБ, прысутнічала выкрыванне «правакацыйных» заяў польскага буржуазнага друку і прадстаўнікоў беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый аб «як быццам бы існуючай сувязі Грамады з камуністычным рухам, удзельнікі якога атрымалі магчымасць легальнай працы. …Увесь польскі буржуазны друк, не выключаючы і левай часткі, адкрыў жорсткую кампанію супраць Грамады, усяляк даказваючы, што гэта партыя з'яўляецца камуністычнай арганізацыяй, і калі прыняла іншую назву, то толькі для таго, каб атрымаць магчымасць легальнай працы». Аўтары папракалі, напрыклад, БХД у распаўсюджванні «ілжывых чутак аб апошняй і ўсяляк даказвала дачыненне Грамады да камуністычнага руху і яе антыдзяржаўнай дзейнасці» [17, с. 206, 211].

Паступова с цягам часу фармулёўкі пачалі істотна мяняцца (верагодна, крызісны стан заходнебеларускага камуністычнага падполля ў 1930-я гг. патрабаваў узмацнення

ролі КПЗБ як авангарда рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі). Эвалюцыя адносін да Грамады выяўлялася праз сцвярджэнні накшталт «БСРГ, не зьяўляючыся камуністычнай арганізацыяй, як гэта ёй прыпісвала дэфензіўная ўлада і беларускія нацыянал-фашысты, але, аднак, яна была выяўнікам інтарэсаў шырокіх працоўных сялянскіх колаў Заходняе Беларусі» [2, с. 23]. А ў 1935 г. была пацверджана не толькі сувязь Грамады з камуністычным рухам, але і кіруючая роля КПЗБ ў стварэнні БСРГ і разгортванні масавага грамадоўскага руху: «Пад кіраўніцтвам КПЗБ …вырастае стотысячная баявая нацыянальна-вызваленчая арганізацыя – Грамада» [36, с. 25].

Адмаўляючы ўдзел у разгортванні грамадоўскага руху прадстаўнікоў непадкантрольных КПЗБ груповак, публікацыі адназначна залічвалі ў стан ворагаў Грамады нацыянальна-дэмакратычныя арганізацыі іх правадыроў, якія, напрыклад, А. Луцкевіч і Р. Астроўскі, у значнай ступені вызначалі палітычнае аблічча Грамады, арганізацыйна забяспечвалі яе функцыянаванне. Увогуле, адлюстраванне гісторыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, Беларускага Сялянскага Саюза, «Беларускай Санацыі» і іншых апанентаў КПЗБ на старонках выданняў БССР можна назваць шальмаваннем, бо іх дзейнасць паказвалася рознымі сродкамі як варожая беларускаму народу, згодніцкая ў адносінах да польскіх уладаў, яны падаваліся лютымі ворагамі БСРГ, КПЗБ, БССР, маргінальнымі групоўкамі, якія не мелі ўплыву сярод шырокіх пралетарскіх і сялянскіх мас [41, с. 34–35].

Танальнасць савецкай гістарыяграфіі ў дачыненні да БСРГ карэнным чынам змянілася пасля трансфармацый крамлёўскай палітыкі ў дачыненні да камуністычнага руху ў Польшчы ў 1930-я гг., калі паступова пачалі згасаць надзеі на перамогу ў ёй пралетарскай рэвалюцыі. Больш таго, у хуткім часе пасля абмену палітвязнямі ў 1932 г. былыя кіраўнікі заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху і БСРГ былі выкрыты як «ворагі народу», арыштаваны і абвінавачаны ў здрадзе інтарэсам працоўнага народа. У БССР была арганізавана кампанія па ачарненні былых герояў нацыянальна-вызваленчага руху. У 1933 г. свет убачыла прапагандысцкая брашура [3], якая распаўсюджвалася ў Заходняй Беларусі і бянтэжыла не толькі паплечнікаў арыштаваных у СССР беларускіх дзеячаў, але і супрацоўнікаў польскіх спецслужбаў, для якіх такі паварот падзей стаў нечаканасцю [15, арк. 120]. Выданне пафасна паведамляла пра раскрыццё і арышт у Савецкай Беларусі банды «контррэвалюцыянэраў, буржуазных нацыяналістаў, якія ў цеснай сувязі і пры супрацоўніцтве з заходнебеларускімі контррэвалюцыянэрамі – Луцкевічам, ксяндзом Станкевічам і іншымі, пад кіраўніцтвам польскай дэфэнзывы рыхтаваліся скінуць савецкую ўладу і зноў увесьці панаваньне капіталістаў і абшарнікаў у Савецкай Беларусі, а на Заходняй Беларусі яшчэ больш узмоцніць уціск і грабеж працоўных». Заказчыкі публікацыі не лічыліся з тым, што ўсе арыштаваныя да гэтага старанна выконвалі іх інструкцыі, а, ігнаруючы іх заслугі перад рэвалюцыйным рухам, не пасароміліся перавярнуць «дагары дном» нядаўнюю гісторыю антыакупацыйнага змагання: «На чале гэтай банды стаялі знаёмыя нам усім былыя паслы польскага Сойму – Рак-Міхайлоўскі, Дварчанін, Гаўрылік, Валошын, Мятла і Бурсевіч» [3, с. 3–4].

Не пазбег такога зняважліва-здзеклівага шальмавання ўслаўлены раней правадыр Грамады Б. Тарашкевіч, які да апошняга выконваў загады арганізатараў камуністычнага падполля Заходняй Беларусі, быў чарговы раз арыштаваны польскімі ўладамі, абменены на Ф. Аляхновіча і сустрэты ў СССР як герой, а пасля рэпрэсаваны ўжо савецкай уладай. Паўтарылі такі лёс і кіраўнікі КПП і КПЗБ, паступова ўвесь камуністычны рух у Польшчы быў скампраметаваны. Афіцыйны роспуск Кампартыі Польшчы ў 1938 г. канчаткова перакваліфікаваў камуністычны рух і падкантрольныя яму арганізацыі, у тым ліку БСРГ, у варожыя і шкодныя. Прыніжэнню і ігнараванню ролі КПЗБ і Грамады ў барацьбе «за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» спрыяў факт ўз’яд-

нання восенню 1939 г. Заходняй Беларусі з БССР у выніку паходу Чырвонай Арміі. Пасля згаданых падзей развіццё рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў гістарычнай літаратуры паказвалася як стыхійны працэс, выкладалася павярхоўна, схематычна [10; 16; 35]. Адносна ўзнікнення Грамады сцвярджался, што арганізацыя была створана з дазволу «ўрада акупантаў», які, садзейнічаючы гэтаму, «разлічваў узяць яе пад свой нагляд і кіраўніцтва, абясшкодзіць масавы рух, разлажыць яго знутры і, нарэшце, разграміць …паставіў на чале Грамады сваіх агентаў-правакатараў з лагеру сваіх прыслужнікаў – беларускіх нацыяналістаў» [19, с. 56, 58].

Пасляваенная беларуская савецкая гістарыяграфія, яе акцэнты і фармулёўкі ў асноўным працягвалі ўсталяваную ў другой палове 1930-х гг. традыцыю. У прыватнасці, у публікацыях Ц.С. Гарбунова ўтрымліваўся цэлы шэраг вульгарызаваных ацэнак і высноў адносна беларускага рэвалюцыйна-дэмакратычнага накірунку: лідары яго ацэньваліся як нацыяналістычныя, БСРГ і яе кіраўнікі характарызаваліся як дробнабуржуазныя, сцвярджалася, што аўтарытэту і папулярнасці Грамады, стварэнне якой санкцыянаваў сам Ю. Пілсудскі, садзейнічала падтрымка яе з боку кампартыі Беларусі. У знішчальна-здзеклівым тоне прадстаўнікі беларускага руху агулам, без уліку партыйнай прыналежнасці, аб'яўліся агентамі польскіх акупантаў [14, с. 119, 137, 140].

Палітычная рэабілітацыя КПЗБ у час працы XX з'езда КПСС стварыла спрыяльныя ўмовы для навуковага асвятлення гісторыі яе і падкантрольных ёй арганізацый, у першую чаргу Грамады. Гэтыя падзеі адкрывалі новы перыяд у даследаванні гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. [41, с. 53]. Пры гэтым падыходы і высновы па пытаннях БСРГ, якія мелі месца ў канцы 1930-х – першай палове 1950-х гг. і акцэнтавалі ўвагу на сувязях, якія нібыта былі паміж кіраўніцтвам Грамады і польскімі спецслужбамі, фігуравалі на старонках навуковых публікацый і ў другой палове 50-х гадоў XX ст. [44, с. 133–134].

Навуковую распрацоўку гісторыя Беларускай сялянска-работніцкай Грамады атрымала дзякуючы творчым намаганням У. Палуяна, які прапанаваў і абгрунтаваў палажэнне аб рэвалюцыйна-дэмакратычным характары Грамады. У 1963 г. У. Палуян абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную БСРГ [37], якая ў 1967 г. выйшла ў выглядзе асобнай манаграфіі «Беларуская сялянска-рабочая грамада» [32]. У названых працах асвятляецца гісторыя БСРГ, узнікненне і пераўтварэнне яе ў масавую рэвалюцыйную арганізацыю. Аўтар прыйшоў да высновы, што па сацыяльна-палітычным характары БСРГ з'яўлялася масавай народнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыяй бяднейшых і сярэдніх сялян, якая змагалася на аснове саюзу рабочых і сялян за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне працоўных Заходняй Беларусі і ўз'яднанне з БССР. БСРГ была створана ў выніку рэвалюцыйнай творчасці народных мас, арганізацыйнай дзейнасці кампартыі і дзеячаў левага рэвалюцыйна-дэмакратычнага крыла нацыянальна-вызваленчага руху. Найважнейшым вынікам палітычнай арганізацыйнай дзейнасці ў 1925–1927 гг. БСРГ і КПЗБ, пад кіраўніцтвам якой яна працякала, на думку аўтара, з'явіліся хуткі рост арганізаванасці і палітычнай актыўнасці працоўных, асабліва сялян, ізаляцыя г.зв. згодніцкіх і нацыяналістычных партый, стварэнне саюзу рабочага класа, бяднейшага і сярэдняга сялянства, уздым рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў другой палове 1926 г. [32, с. 87–89, 207, 213]. Як бачым, некаторыя з заяўленых тэзісаў маюць відавочна дэкларатыўны характар, у тым ліку выснова аб ізаляцыі «згодніцкіх і нацыяналістычных партый» і «стварэнне саюзу рабочага класа». Да таго ж у даследаванні У. Палуяна чытач не знойдзе ўдзячных слоў на адрас, напрыклад, А. Луцкевіча і Р. Астроўскага, без якіх цяжка ўявіць гісторыю Грамады. Няма там асэнсавання ролі і месца БСРГ у камінтэрнаўскіх ваенна-стрэтагічных планах, як і больш глыбокага пранікнення ў прычыны забароны польскімі ўладамі шматколькаснай, але, як паказала гісторыя, бязвольнай арганізацыі, якая не здолела (ці па нейкай невядомай волі не за-

хацела) арганізаваць сваёй больш рашучай абароны. Працуючы ва ўмовах савецкай арганізацыі навукі, У. Палуян не мог дазволіць сабе вывесці канцэптуальны характар свайго даследавання за межы ўсталяваных падыходаў.

Дзякуючы даступным сёння архіўным дакументам прыватнага характару вядома, што манаграфія і кандыдацкая дысертацыя У. Палуяна «са скрыпам» праходзілі ўзгадненні, паводле інфармацыі самога аўтара, былі падрыхтаваны задоўга да друку і абароны (за 9 і 1 год адпаведна), а значыць выклікалі пытанні ў адказных інстанцыях. У. Палуян у сваім лісце ад 20 чэрвеня 1962 г. да аўтарытэтнага знаўцы пытанняў гісторыі і гістарыяграфіі Заходняй Беларусі М. Арэхвы, які меў шмат прэтэнзій да У. Палуяна і І. Палуяна адносна іх кнігі [38], у роспачы паведамляў аб тым, што «вось ужо чатыры гады маю дысертацыю аб Грамадзе ў Акадэміі не пускаюць у друк, а хто не пускае, Вам не цяжка здагадацца. …Грамаду ж яны (Белдзяржвыд. – *А.С.*) не захацелі ўзяць як больш вузкае пытанне, а можа і па іншых разважаннях» [31, арк. 112адв].

Гісторыя БСРГ як масавай народнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі атрымала асвятленне на стронках кандыдацкіх, доктарскіх дысертацый, манаграфій да іх і навуковых публікацый па гісторыі Заходняй Беларусі і КПЗБ, а таксама прысвечаных героям нацыянальна-вызваленчага руху, у першую чаргу Б. Тарашкевічу [41, с. 57–61, 75]. У сувязі з адлюстраваннем гісторыі БСРГ пажадана адзначыць актуальную і сёння кнігу «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии» пра ліквідатарскія тэндэнцыі і настроі ў некаторых мясцовых арганізацыях КПЗБ. Сельскія камуністы актыўна дэманстравалі нежаданне праводзіць партыйную працу, былі перакананы ў тым, што БСРГ і ёсць сапраўдная партыя. Многія ячэйкі КПЗБ самараспусціліся [40, с. 142–143]. Гэтыя звесткі з’яўляюцца красамоўным сведчаннем папулярнасці і аўтарытэту Грамады і штучнасці камуністычнага ўплыву, які грунтаваўся на поспехах беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Аналізуючы савецкую гістарыяграфію БСРГ другой паловы 1950-х–1980-х гг., трэба адзначыць відавочнае: грамадскі клімат не спрыяў, а агульнаметадалагічны стан айчыннай навукі не дазваляў аб’ектыўна даследаваць яе гісторыю. Праўдзівая інфармацыя пра стварэнне Грамады, яе адносіны з куратарамі ад кампартыі, маніпуляванне арганізацыяй і яе членамі ў інтарэсах распальвання сацыялістычнай рэвалюцыі, навязванне ёй чужых, шкодных беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху лозунгаў была схавана ад даследчыкаў у спецсховішчах ці не магла быць уведзена ў навуковы ўжытак з-за існавання жорсткай цэнзуры.

Трэба адзначыць, што польскія даследчыкі часоў ПНР працавалі ў больш спрыяльных для паўнавартаснай навукой дзейнасці ўмовах, якія праугледжвалі правядзенне дыскусій і спрэчак, выказвання альтэрнатыўных меркаванняў, у тым ліку ў дачыненні да Грамады [22]. Асаблівая заслуга ў гэтым справядліва надаецца плённай навуковай дзейнасці А. Бергман па вывучэнні жыцця і дзейнасці Б. Тарашкевіча. Высока ацаніў яе і М. Арэхва, былы паплечнік і кіраўнік па заходнебеларускім камуністычным падполлі, які адзначыў у сваіх заўвагах да артыкула пра Б. Тарашкевіча ў БелСЭ, што ў спасылках на крыніцы трэба на першае месца ставіць працу А. Бергман, «а потым – усе астатнія. Яна галоўны даследчык біяграфіі Б. Тарашкевіча», «віншую цябе з вялікім навуковым поспехам» [30, арк. 99, 139]. Як абгрунтавана адзначыла беларуская даследчыца В. Матусевіч, публікацыі А. Бергман сведчаць аб значнай эвалюцыі яе падыходаў да асноўных праблем развіцця беларускіх палітычных партый. Ад трактоўкі БСРГ як арганізацыі, створанай на аснове партыйнай сеткі КПЗБ і падпарадкаванай ёй, ад асуджэння нацыяналістычнай сутнасці Беларускай сацыялістычнай грамады і БРА, а таксама палітыкаў, якія стаялі на нацыянальных некамуністычных пазіцыях, А. Бергман перайшла да рэабілітацыі ў гісторыі гэтых жа палітыкаў і беларускай нацыянальнай ідэі, асуджэння нацыянальнага нігілізму ў шэрагах КПЗБ [22, с. 67–68]. Гэтыя акалічнасці ўзмац-

няюцца ўласным досведам А. Бергман і фактам яе актыўнага ўдзелу ў грамадоўскім руху: «Я ж ведала ўсе акругі (КПЗБ. – *А.С.*), акрамя Пінска, а ў 1926 г. на працягу 9 мес. уласнымі ручкамі і ўласнымі ножкамі (гал. чынам) топала па Баранавіцкай акрузе і ўшчыльную да лютага 1927 г. – г.зн. увесь перыяд Грамады – што зразумела не прапала». І вось у сярэдзіне 1960-х гг. ёй «давялося ў асноўным самой разгрызаць і памучыцца над разуменнем многіх пытанняў, звязаных з Грамадой. І толькі ў 1965 годзе ў Маскве атрымала архіўныя матэрыялы, па якіх удалося скарэкціраваць свае высновы. Ого! Не мала было перашкод (зразумела з боку сваіх, і пагроз і чаго толькі хочаш). Але мне дапамагло разабрацца ў самых складаных пытаннях тое, што я ведала добра механізм дзеяння нашага апарату (ва ўсіх яго звеннях)…» [29, арк. 10]. Таму вынікі навукова-даследчай працы А. Бергман і сёння ўяўляюць несумненную цікавасць [6; 7; 45–48].

Якасна новы перыяд развіцця айчыннай гістарычнай навукі і заходнебеларускай гістарыяграфіі пачаўся ў пачатку 1990-х гг. пасля распаду СССР і ўстанаўлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь, калі пачалося арганізацыйна-метадалагічнае ўдасканаленне вывучэння заходнебеларускай праблематыкі, у тым ліку гісторыі Грамады [41, с. 155–162]. Даследчыкі, закранаючы праблематыку БСРГ, справядліва адзначаючы высокі навуковы ўзровень даследаванасці праблемы дзякуючы намаганням У. Палуяна і А. Бергман, а часам і справядліва крытыкуючы («Сёньня яна безнадзейна састарэла», – А. Сідарэвіч аб манаграфіі У. Палуяна [42, с. 192]), узбагацілі працэс метадалагічнага і крыніцазнаўчага асэнсавання гісторыі БСРГ. Больш адэкватна зразумець абставіны, звязаныя з утварэннем, дзейнасцю і забаронай Грамады, дапамагаюць матэрыялы арганізаванай у 2005 г. навуковай канферэнцыі «Беларуская сялянска-работніцкая грамада ў кантэксце нацыянальнага адраджэнння XIX–XX стст.». Пашырэнне праблематыкі БСРГ назіраецца на прыкладзе артыкулаў А. Пашкевіча аб першапачатковым перыядзе Грамады, А. Вашкевіча аб яе ўзаемадзеянні з БХД і А. Чарнякевіча – з беларускімі паланафіламі, а таксама Я. Мірановіча, А. Смалянчука і С. Токця, даследаванне якога прыцягвае ўвагу зваротам да лакальнага грамадоўскага руху на гмінным узроўні [12]. Значны ўклад у распрацоўку праблематыкі БСРГ ў культурна-асветніцкім кантэксце Заходняй Беларусі зрабіў А. Вабішчэвіч [9]. У навуковых працах А. Пашкевіча стварэнне Грамады абгрунтавана пададзена як вынік эвалюцыі поглядаў палітычна актыўнай часткі беларускага грамадства, у першую чаргу беларускіх паслоў у польскім сейме, на фоне і з улікам ўзаемадзеянняў прадстаўнікоў рознаскіраваных груповак. Утварэнне пасольскага клуба БСРГ стала лагічным завяршэннем працэсаў агульнай радыкалізацыі і падпадання часткі беларускіх паслоў пад камуністычны ўплыў, у выніку чаго адбыўся падзел беларускага парламенцкага прадстаўніцтва. Немагчымасцю беларускіх прадстаўнікоў абараніць свае правы чыста парламенцкімі формамі змагання скарысталі камуністычныя ўлады суседняга СССР, якія праз мясцовыя падкантрольныя Камінтэрну арганізацыі здолелі пераканаць частку беларускіх парламентарыяў у неабходнасці пераходу з нацыянальных на класавыя пазіцыі [34, с. 57]. Планы стварэння масавай арганізацыі былі і ў бальшавіцкага кіраўніцтва, каторае ідэі нацыянальна-вызваленчага характару падмяняла сацыяльна-класавымі, разлічваючы рэалізаваць свае планы шляхам расколу БПК. Камуністы скарысталі сваю звычайную тактыку: ёсць амаль арганізаваны беларускі рух, значыць трэба гэты рух узначаліць. Што і адбылося, але камуністы, вызначаючы характар БСРГ у час працы III канферэнцыі КПЗБ (тэрытарыяльная, ці нацыянальная арганізацыя), усё ж вымушаны былі азірацца на заснавальнікаў Грамады [12, с. 170].

Разважаючы пра ўтварэнне БСРГ, важна ўлічваць той своеасаблівы ідэйна-палітычны грунт для ўзнікнення масавай беларускай сялянскай партыі, пра неабходнасць стварэння якой гаварылі, у прыватнасці, беларускія хадэкі [12, с. 37–38]. А. Сідарэвіч увогуле лічыць А. Луцкевіча бадай што большым «бацькам» Грамады, чым Б. Тарашке-

віча [42]. Падставай для гэтай высновы стала актыўная навукова-публіцыстычная дзейнасць А. Сідарэвіча па вывучэнні грамадска-палітычнай спадчыны А. Луцкевіча, якая ў савецкай навуковай літаратуры атрымала негатыўнае асвятленне, а сёння з'яўляецца яскравым прыкладам разумення тагачасных рэалій праз разнапланавае асэнсаванне асобы. Разам з наратыўнымі матэрыяламі А. Сідарэвіч падрыхтаваў і апублікаваў аналітычныя працы, прысвечаныя асэнсаванню месца А. Луцкевіча ў беларускім нацыянальным, у тым ліку грамадоўскім руху [41, с. 178]. Асцярожна ставячыся да сцвярджэнняў адносна ўстойлівага недаверу і апазіцыйнасці А. Луцкевіча да камуністаў, акцэнтуем увагу на інфармацыі А. Сідарэвіча пра «вырашальны ўплыў» А. Луцкевіча на жыццё Грамады [42, с. 216]. Ліст ад 18 кастрычніка 1927 г. куратара беларускага руху ў Польшчы А. Ульянава начальству з грыфам «зусім сакрэтна» дае падставы для ўяўленняў пра больш шчыльныя адносіны радыкала А. Луцкевіча з камуністамі: «У сувязі з надыходзячым працэсам «Грамады» арыштавалі на днях Антона Луцкевіча, аднаго з дзеячаў радыкальнага беларускага руху. Для беларускіх радыкалаў гэта несумненна вельмі вялікая страта, так як вакол яго аб'ядноўваліся найбольш радыкальна настроеныя беларускія элементы. …Яго арышт зрабіў у Вільні цяжкае ўражанне» [27, арк. 104–108].

Актуальнымі застаюцца думкі А. Бергман, якія выказаны ў яе пашыраным і перакладзеным на беларускую мову выданні «Слова пра Браніслава Тарашкевіча» аб ступені пранікнення ў грамадоўскі рух рэвалюцыйных і камуністычных уплываў, аб крыніцах і скіраванасці партыі. Камуністы былі яе вядучай сілай, але па колькасці складалі нязначны працэнт. Стрыжнем руху з'яўляліся сяляне, для якіх барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне была чымсьці непадзельным, Грамада захапіла нават далёкія ад камунізму элементы, для якіх галоўнымі былі нацыянальныя пастулаты. Гэтае меркаванне даследчыцы пацвярджаецца ўспамінамі актыўнага ўдзельніка Грамады і «Змагання» С. Хмары, які звязваў поспех Грамады з шырокім распаўсюджваннем у пачатку 1920-х гг «БНР-партызанкі», амаль у кожнай вёсцы жылі даўнейшыя партызаны. Адносна вядучай ролі камуністаў на месцах С. Хмара выказаў адваротную думку: больш хутка рост грамадоўскіх ячэек ішоў там, дзе не было камуністычных ячэек, КПЗБ напачатку выдала загад «камуністам не ўступаць у Грамаду, а толькі «супрацоўнічаць», ды папіхаць на рэвалюцыйныя дзеі» [43]. Па меркаванні А. Бергман, правакацыйнасць дзеянняў камуністаў спрычынілася да таго, што да руху далучыліся свядомыя праціўнікі яго рэвалюцыйных тэндэнцый, якія хацелі стрымаць радыкалізацыю легальнай партыі і на яе падставе дабівацца паляпшэння беларускай справы, яны мелі намер пры першай жа магчымасці скіраваць гэты рух у спакайнейшую каляіну. Аднак большасць не паддавалася ілюзіям, не верыла ў магчымасць задавальнення сваіх патрэб польскімі ўладамі і ўскладвала надзеі на рэвалюцыйную барацьбу і ўз'яднанне з БССР. Небеспадстаўна А. Бергман лічыла, што ніякі радыкальны масавы рух у Заходняй Беларусі не мог бы арганізацыйна сфарміравацца зусім легальна, а быў бы задушаны ў зародку. Да пачатку грамадоўскага руху, працягвала даследчыца, была праведзена прадуманая падрыхтоўчая акцыя, у якой камуністычныя арганізацыі і Незалежная сялянская партыя (НПХ) адыгралі значную ролю [7, с. 37–38, 95–96]. Аднак, як справядліва выказаліся У. Палуян і А. Вабішчэвіч, масавы характар Грамады і яе прасавецкая арыентацыя выкліканы не столькі ідэалагічнай і фінансавай падтрымкай з усходу, сімпатыяй да савецкай краіны, колькі аб'ектыўнымі ўмовамі, з прычыны непрыняцця антыбеларускай нацыянальнай палітыкі польскіх улад [13, с. 396].

Выклікае цікавасць дыскусія на старонках «Беларускай мінуўшчыны» аб ліквідацыі БСРГ, у якой Л. Герасімаў справу знішчэння Грамады прыпісаў савецкай уладзе, КПЗБ пры дапамозе Камінтэрна і чэкістаў [11, с. 42–44]. На такі аднабаковы падыход, які відавочна спрашчае гісторыю пытання, крытычна адрэагаваў Р. Лазько, звяртаючы ўвагу на імкненне камінтэрнаўскага кіраўніцтва выкарыстаць БСРГ у «працярэбліван-

ні» шляху ў Еўропу для будучай сацыялістычнай рэвалюцыі, удакладніў меркаванне свайго апанента і абгрунтавана заявіў: БСРГ стала ахвярай дзвюх дыктатур – бальшавіцкай і санацыйнай [21, с. 46–49]. Безэмацыйны аналіз тагачаснай сітуацыі прыводзіць да высновы, што савецкае кіраўніцтва прагматычна вырашыла не распачынаць вайну з Польшчай і Еўропай з-за беларускага пытання. Дакументы Прадстаўніцтва КПЗБ адлюстроўваюць насцярожанае стаўленне да сітуацыі, якая склалася вакол БСРГ і яе настойлівага руху да ўзброенага паўстання, што непакоіла партыйнае кіраўніцтва [26–28]. Варта ўзгадаць выказванне Янкі Купалы пра правакацыйную ролю ў гісторыі БСРГ А. Ульянава, які «перш дапамог Тарашкевічу стварыць Рабоча-сялянскую Грамаду, а пасля памог разграміць яе і пасадзіць Тарашкевіча за краты» [20, с. 10].

У гістарыяграфіі не вырашана праблема колькасці сябраў БСРГ: фігуруюць лічбы ў больш чым 100 тысяч, каля 120 тысяч, каля 150 тысяч і нават 160 тысяч. У. Палуян ў сваіх працах падаваў колькасць сябраў БСРГ каля 120 (117) тыс.чалавек на 1 лютага 1927 г. [32, с. 152–153] і каля 120 тысяч, якія былі аб'яднаны ў каля 2 тысяч гурткоў (на студзень 1927 г.) [33, с. 416]. У. Палуян, як член рэдкалегіі і складальнік адпаведнага выдання, ведаў звесткі «генеральнага сакратара БСРГ» М. Бурсевіча на 22 сакавіка, дзень афіцыйнага зачынення Грамады, – 150 тыс. асоб [8, с. 554], аднак разумеў іх завышанасць. Але і лічба «каля 120 тыс.» хутчэй за ўсё завышаная і была наступствам прапагандысцкага жадання кіроўнікоў БСРГ і КПЗБ павялічыць колькасць «рэвалюцыйных шэрагаў» Заходняй Беларусі. Выяўленыя ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь дадзеныя даюць падставы крытычна ставіцца да вышэй прыведзеных паказчыкаў. Так, паводле наяўнай інфармацыі, да 10 снежня 1926 г. Грамада мела 66 996 членаў, якія аб'ядноўваліся ў 1 720 гурткоў. Пададзена і дынаміка росту Грамады ў другой палове 1926 г.: 569 чалавек, 19 гурткоў (чэрвень); 3 144 чалавекі, 122 гурткоў (ліпень); 12 529 чалавек, 561 гурток (жнівень); 30 828 чалавек, 1 062 гурткі (верасень); 43 570 чалавек, 1 374 гурткі (кастрычнік); 62 092 чалавекі, 1 658 гурткоў (лістапад) [26, арк. 50–51]. (Аналагічная інфармацыя прыведзена А. Бергман са спасылкай на «Беларускі каляндар» за 1927 г. з упамінаннем беларускага сенатара Ю. Сабалеўскага аб 98 тыс. сябраў БСРГ [47, s. 121–122]). Наўрад ці партыйныя функцыянеры, якія складалі адпаведныя справаздачы, мэтанакіравана заніжалі паказчыкі, хутчэй, наадварот, і наўрад ці за месяц колькасць БСРГ магла падскочыць амаль удвая, нават з улікам шырока распаўсюджаных у Заходняй Беларусі паўстанцкіх настрояў і папулярнасці Грамады. Рост БСРГ выглядае сумніўным на фоне фактычна распачатай ужо ў канцы 1926 г. акцыі паліцэйскіх органаў па закрыцці грамадоўскіх гурткоў. На гэта звярнуў увагу У. Палуян, адзначаючы, што «ў шэрагу месц паліцыя пачала ліквідацыю гурткоў Грамады, суправаджаючы гэта масавымі арыштамі» [32, с. 168–169].

**Заключэнне**

Такім чынам, гісторыя Беларускай сялянска-рабочай Грамады з самага ўзнікнення стала аб'ектам увагі перыядычных выданняў і навуковых публікацый, канцэптуальная скіраванасць і танальнасць якіх значна мяняліся ў залежнасці ад грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне. І калі ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. БСРГ мела гераічна-кампліментарныя водгукі, то ў другой палове 1930-х – сярэдзіне 1950-х гг. яе кваліфікавалі ў асноўным як дыверсію агентуры дыфензівы для расколу і знішчэння рэвалюцыйнага руху. Лібералізацыя грамадска-палітычнага жыцця ў СССР садзейнічала гістарычнай рэабілітацыі БСРГ і дзеячаў яе левага крыла, у той час як прадстаўнікі правага фланга не згадваліся ці засталіся з рэзка негатыўнымі фармулёўкамі. І хоць у гэты час былі зроблены маштабныя напрацоўкі факталагічнага характару, у першую чаргу У. Палуянам, умоў для паўнавартаснага даследавання Грамады не было. У 1990-я–2000-я гг. айчынная гістарычная навука ажыццявіла значныя агульнаметадалагічныя

і крыніцазнаўчыя захады па ўдасканаленні гістарычнага вобраза легендарнай беларускай партыі для стварэння праўдзівай і несупярэчлівай гісторыі БСРГ.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Адчыненне Беларускага кааператыўнага банку ў Вільні // Савецкая Беларусь. – 1925. – 20 ліст.
2. Багданскі, Я. Аб клясавай барацьбе ў Заходняй Беларусі ў часы Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады / Я. Багданскі, Л. Бабровіч. – Менск : Беларус. Акадэмія навук, камісія Заход. Беларусі, 1932. – 67 с.
3. Барун, Пятро. Выкрыцьце правакатарскай банды Луцкевіча – Дварчаніна – ПЕРАМОГА нацыянальна-вызваленчага руху на Заходняй Беларусі / Пятро Барун. – Вільня, 1933. – 23 с.
4. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. – Менск : Дзяржвыдавецтва, 1928. – 54 с.
5. Белорусская крестьянско-рабочая громада // Правда. – 1925. – 26 июня.
6. Бергман, А. Беларуская сялянска-работніцкая грамада (1925–1927) / А. Бергман // Навуковы зборнік. – Беласток : Галоўнае праўленне БГКТ ў Польшчы, 1964. – С. 95–130.
7. Бергман, А. Слова пра Браніслава Тарашкевіча. Гістарычны жыццяпіс / А. Бергман. – Мінск : Маст. літаратура, 1996. – 192 с.
8. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Документы и материалы : в 2 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС, Ин-т истории АН БССР, Архивное управл. при Совете Министров БССР. – Минск : Госиздат БССР, 1962. – Т. I. (1921–1929 гг.). – 620 с.
9. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.
10. Гарбуноў, Ц. Год пад сцягам саветаў / Ц. Гарбуноў. – Мінск : Дзярж. выд-ва пры СНК ; рэд. паліт. літ-ры, 1940. – 56 с.
11. Герасімаў, Л. Хто знішчыў сялянскую «Грамаду»? / Л. Герасімаў // Беларуская мінуўшчына. – 1993. – № 2. – С. 42–44.
12. Гістарычны альманах. Т. 12. – Гародня ; Беласток, 2006. – 248 с.
13. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – 613 с.
14. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит-ры, 1948. – 232 с.
15. Информация поветовой комендатуры, донесения полицейских и агентов полиции, переписка с комендатурой // Государственный архив Брестской области. – Ф. 2028. Оп. 1. Д. 265.
16. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – М. : Гос. изд-во полит. лит-ры, 1939. – 40 с.
17. Западная Белоруссия : сб. статей. – Кн. 1. – Менск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – 211 с.
18. Западная Белоруссия на скамье подсудимых. Процесс Белорусской Крестьянско-Рабочей Громады. – Минск : Белорус. гос. изд-во, 1929. – 263 с.
19. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / пад рэд. Н. М. Нікольскага і І. Ф. Лочмеля. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – 96 с.

20. Илькевич, Н. Н. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР (фальсификация органами НКВД уголовных дел в 1937–1938 гг.) / Н. Н. Илькевич, Р. П. Платонов. – Минск : БелНИИДАД, 1997. – 100 с.

21. Лазько, Р. Хто ж знішчыў «Грамаду»? / Р. Лазько // Беларуская мінуўшчына. – 1994. – № 2. – С. 46–49.

22. Матусевич, О. А. Политические партии и общественные организации Западной Беларуси 1920-х–1930-х годов в польской историографии : дис. … канд. ист. наук : 07.00.09 / О. А. Матусевич ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2009. – 167 с.

23. Выписки из протоколов заседаний оргбюро ЦК ВКП(б). Докладные записки ЦК КП(б)Б в ЦК ВКП(б) и переписка по вопросу возвращения секретных документов и др. 1 декабря 1927 г. – 19 февраля 1929 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3704.

24. Перепечатка из газет о революционном движении в Западной Белоруссии (1925 год). Февраль 1925 – декабрь 1925 г. // НАРБ. – Ф. 60п. Оп. 3. Д. 600.

25. Докладная записка ЦК КПП и КПЗБ в ИККИ и Политбюро ВКП(б) о «повстанческих настроениях» в Западной Белоруссии и задачах КПЗБ, информация Представительства о деятельности и состоянии компартии Западной Белоруссии за период январь – февраль 1932 г. // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 1. Д. 80.

26. Месячные отчеты ЦК Компартии Западной Белоруссии (1925 г.) // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 2. Д. 61.

27. Информационные письма советника Полпредства СССР в Польше (представителя ЦК Компартии Белоруссии) и др. лиц в Представительство Компартии Западной Белоруссии. Январь 1927 – октябрь 1927 г. // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 116.

28. Докладная записка ЦК Компартии Польши и Западной Белоруссии в ИККИ «О повстанческих настроениях в Западной Белоруссии и задачах КПЗБ». 1-й комплект (1927) // НАРБ. – Ф. 242п. Оп. 2. Д. 128.

29. Пісьмы В. Абрамавай, М. Р.Адзінца, А. Бергман, П. Броўкі, М. С. Арэхве // НАРБ. – Ф. 976. Оп. 1. Д. 47.

30. Статьи, тексты выступлений о КПЗБ по радио в связи с 50-летием БССР, с 40-летием БКРГ, высказывание В. Гомулки о роспуске КПП, о I съезде КПЗБ, переписка с местными музеями и другие. 1957–1984 гг. // НАРБ. – Ф. 1440. Оп. 3. Д. 1097.

31. Рецензии и отзывы В. И. Полуяна, И. В. Полуяна и Т. Ю. Глинской о истории КПЗБ. Ч. I : 1958–1966 гг. // НАРБ. – Ф. 1440. Оп. 3. Д. 1100.

32. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.

33. Палуян, У. А. Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. / У. А. Палуян // Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / М. П. Касцюк [і інш.] ; Ін-т гісторыі АН Беларусі ; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1995. – Ч. 2. – С. 214–264.

34. Пашкевіч, А. В. Парламенцкія формы змагання за нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага народа ў міжваеннай Польшчы (1921–1939) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Пашкевіч ; Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск, 2006. – 163 с.

35. Пичета, В. Исторические судьбы Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. – М. : Моск. рабочий, 1939. – 40 с.

36. Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине / Белорус. акад. наук, Комис. по изучению Зап. Белоруссии ; под ред. С. Скульского. – Минск : Белорус. Акад. наук, 1935. – 335 с.

37. Полуян, В. А. Белорусская крестьянско-рабочая Громада в борьбе за социальное и национальное освобождение трудящихся Западной Белоруссии в 1925–1927 гг. :

дис. … канд. ист. наук / В. А. Полуян ; Акад. наук БССР; Ин-т истории. – Минск, 1963. – 523 с.

38. Полуян, В.А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.

39. Прычыны расколу Беларускага пасольскага клубу ў польскім сойме // Савецкая Беларусь. – 1925. – 19 ліп.

40. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.

41. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

42. Сідарэвіч, А. Антон Луцкевіч і Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада / А. Сідарэвіч // ARCHE Пачатак. – 2007. – № 9 – С. 192–218.

43. Хмара, С. Успаміны пра Грамаду / С. Хмара // Пагоня. – 1995. – 13–19 студз.

44. Царюк, А. В. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за свое освобождение (1921–1927 гг.) / А. В. Царюк // Сб. науч. работ. – Минск : БГУ, 1958. – Вып. 1(40). – С. 113–138.

45. Bergman, A. Białoruska Włościańsko-Robotnicza Hromada (1925–1927) / A. Bergman // Z Pola Walki. – 1962. – № 3. – S. 73–99.

46. Bergman, A. KPZB a Hromada / A. Bergman // Materiały z sesji popularno-naukowej poświęconej 40-tej rocznicy powstania Białoruskiej Włościańsko-Robotniczej Hromady, Białystok, 27 październikа 1965 r. / Wydział Propagandy KW PZPR w Białymstoku ; pod red. M. Nosowicza. – Białystok, 1973. – S. 81–96.

47. Bergman, A. Rzecz o Bronisławie Taraszkiewiczu / A. Bergman. – Warszawa : Książka i wiedza, 1977. – 243 s.

48. Bergman, A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. – Warszawa : PWN, 1984. – 287 s.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 18.05.2015

***Savich A.A.*** **Domestic Historiography of the Belarusian Peasant Working Gromada (to 90th anniversary of the party)**

*The study reflects the main scientific and methodological parameters of sources and the development and improvement of the historiography of Belarusian peasant working Gromada during the second half of the 1920s–2000s. Based on a wide variety of historiographical and archival sources identified the stages in the development of historiography of the issue, the main approaches to the study of history of BKRG, formulation and evaluation of the party and its leaders are revealed, concluded that there were grounds for a more objective history BKRG.*